*Любоў Дуктава*
*Магілёўскі дзяржаўны універсітэт імя А.А. Куляшова г. Магілёў, Беларусь*

# АСАБЛІВАСЦІ СТВАРЭННЯ ВОБРАЗНАГА СВЕТУ Ў АПОВЕСЦІ АЛЕСЯ НАВАРЫЧА “ЦКАВАННЕ ВЯЛІКАГА ЗВЕРА”

У беларускай літаратуры другой паловы XX стагоддзя шмат твораў, у якіх галоўнымі героямі выступаюць прадстаўнікі фауны. Сучасная мастацкая анімалістыка вылучаецца сваім сацыяльным зместам, актуальнай экалагічнай і гуманістычнай



хив библиотеки МГУ имени

накіраванасцю. Творы пра жывёл сведчаць пра якасна новыя ідэйна-творчыя пошукі беларускіх пісьменнікаў. Паколькі сучасныя аўтары імкнуцца да глыбокага асэнсавання праблем існавання, выжывання жывёльнага свету, то гэта вымагае ад іх (пісьменнікаў) адпаведнага мастацкага ракурсу. Таму мэта нашага даследавання: вызначэнне асаблівасцей стварэння вобразнага свету ў аповесці Алеся Наварыча "Цкаванне вялікага звера". Для дасягнення гэтай мэты неабходна вырашэння наступных задач: вызначыць тып анімалістычнага вобраза паводле спосабу адлюстравання; выявіць асаблівасці ўспрымання гэтага вобразу на розных узроўнях і яго філасофскую аснову. Падобны аналіз дасць магчымасць больш ярка выявіць актуальныя праблемы беларускага грамадства.

Мастацкая анімалістыка практычна не заўважалася ў савецкім літаратуразнаўстве; анімалістычныя вобразы характарызаваліся часцей як другасныя вобразы твора, якія, як правіла, разглядаліся як састаўная частка пейзажу. "Адной з асноўных прычын гэтага, – зазначае А. Бельскі ў артыкуле "Мастацкая анімалістыка ў сучаснай беларускай літаратуры (да праблемы вывучэння і тыпалогіі)", – можна лічыць развіццё беларускай літаратуры пераважна ў сацыялагічным аспекце. Сёння літаратуразнаўцы найперш улічваюць спосабы і формы ўласна мастацкага ўвасаблення рэчаіснасці" [1, с. 29]. У даследаваннях айчынных літаратуразнаўцаў і крытыкаў анімалістыка як мастацкая сістэма прадстаўлена фрагментарна, у асноўным у межах характарыстыкі асобных анімалістычных вобразаў пэўных твораў. Істотныя напрацоўкі ў гэтым кірунку зроблены ў кнігах і артыкулах беларускіх літаратуразнаўцаў А. Бельскага [1; 2], В. Козіч [4], Т. Шамякінай [8]. Да разгляду анімалістычнай тэмы ў сучаснай рускай прозе звярнуліся рускія даследчыкі М. Эпштэйн [9], А. Смірнова, А. Астапенка [7], украінская даследчыца А. Казлова [5].

У беларускай літаратуры другой паловы XX стагоддзя мэтазгодна вылучыць пяць тыпаў анімалістычных вобразаў: жывёлы як рэаліі прыроды, анімалістычныя вобразы-сімвалы, анімалістычныя вобразы-алегорыі, фантастычныя вобразы, псіхалагізаваныя анімалістычныя вобразы [3]. Асобае месца займаюць вобразы, створаныя на сумежжы вылучаных груп. Паказальнай у гэтых адносінах з'яўляецца аповесць "Цкаванне вялікага звера" А. Наварыча.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А. А. Кулешова

Сярод цэнтральных персанажаў твора асобае месца займае спецыфічны вобраз чалавека-жывёлы – Леўка Грыцаў. Ён у гады вайны прыслужваў немцам, пасля перамогі схаваўся ў лесе, затым не толькі прыбіўся да ваўкоў, але і стаў нават іх правадыром: "Цемра, страшная цемра насунулася на Леўку, і ён нема завыў у гэтай суцэльнай цемрадзі, губляючы рэшткі розуму... І ў адказ пачуў выццё ваўкоў, якіх не баяўся, бо сам зрабіўся ваўком" [6, с. 66]. Я-свядомасць Леўкі адмаўляецца ад чалавечага сацыяльнага асяродку, ад грамадскіх законах: "Я памру, – мыркнуў Леўка. – Я даўно памёр, даўно не жывы, ні для цябе, ні для мацеры <...>" [6, с. 66].

У аповесці пераплецены элементы рэалістычнага і фантастычнага. Між іншым, з'ява, калі чалавек можа адчуваць сябе ваўком, у медыцынскай літаратуры мае тэрмін "лікантропія". У творы сустракаецца шэраг фактаў, якія маюць ірэалістычны пачатак. Напрыклад, тое, што чалавек, адасобіўшыся ад людзей, за некалькі год стаў правадыром у ваўкоў. На гэты конт А. Карпюк слушна заўважае: "У вядомым творы Дэфо апісаны момант, калі герой назірае, як тоне чужы парусьнік. Рабінзон раздзяваецца ды плыве да яго. На апусцелай палубе знаходзяцца карысныя рэчы. Доўга не думаючы, напіхвае імі свае кішэні і плыве на бераг. Дэфо так нас зачароўвае, што і не заўважае падвоху – адкуль жа ў голага героя маглі з'явіцца кішэні.

Падобнае не раз спатыкаеш і ў гэтай кнізе.

Ведаеш дасканала, што адзічэлы Грыцаў Леўка не можа гэтак бегаць за ваўкамі, бо магчымасці чалавечага арганізму абмежаваныя. Але матэрыял у аповесці так па-майстэрску пададзены, што алагізму і не заўважаеш" [6, с. 4].

З самага пачатку твора і да канца прасочваецца двайстасць асобы гэтага героя. Ён імкнецца прыстасавацца да чужога для яго чалавечай сутнасці асяродку – звярынага.

Між іншым, успрыняцце дуалістычнага вобраза абумоўлена тым, як аўтар называе свайго героя. Звер, Важак, Гаспадар, Леўка Грыцаў – усё гэта адна асоба: "Ваўкі і не думалі вылазіць з асочанага лясочку. Тут, недалёка ад рэчкі, было зацішна. Не ўпудзіліся звяры і тады, калі да лёжкі прыцёгся па іхніх слядах ваўчыны правадыр. Важак, якога яны не заўсёды слухалі. Абраслы густым валоссем, пакрыты замік шапкі дзіравай анучай чалавек апусціўся на калені" [6, с. 21]. І яшчэ: "Звер ад ваўчынага рагалосся ўстрыбушнуўся, зароў пагрозліва,



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

пасунуўся далей аж жылля. Праз некаторы час за галаслівым зверам цяглася зграя ваўкоў. Драпежнікі прынюхваліся да настаўбуранага звера, раптоўна адскоквалі, калі той рабіў рэзкі рух, нешта адкідваючы ад сябе. Тады ваўкі смела кідаліся наперад, грызліся з-за падачкі. Звер быў іхні Важак, быў іхні Гаспадар" [6, с. 7]. Выкарыстанне фантастыкі ў творы дапагае стварыць трагічны вобраз чалавека-здрадніка. Дадзены твор сведчыць пра маральна-філасофскія шуканні пісьменніка, пошукі адказу на хвалюючыя пытанні чалавечай душы.

Калектыўная свядомасць успрымае Леўку як ваўкалака, які здольны быць як чалавекам, так і жывёлай. Уводзячы гэты элемент аўтар падкрэслівае трагічнасць вобраза здрадніка: яго не прымаюць людзі, ён сам запускае "праграму самаразбурэння".

Трагічнасць вобраза Леўкі-ваўка падкрэсліваецца тым, што герой знаходзіць пацверджанне сваім высновам адносна ўласнай звярынай сутнасці ў адносінах да яго аднавяскоўцаў, раней блізкіх яму людзей.

Падобнае адлюстраванне вобразнай сістэмы ў мастацкім творы з'яўляецца ілюстрацыяй уплыву філасофскіх ідэй экзістэнцыяналізму. Сутнасць леўкавай душы выяўляецца ў час яго хваравітага стану, калі ён адчувае сябе чужым у гэтым свеце, бо перажывае комплекс віны за сваю здраду. У дадзеным напаўанімалістычным вобразе рэалізуюцца архетыпныя ўстаноўкі лішняга чалавека. Унутраны канфлікт паміж гэтымі архетыпнымі ўстаноўкамі і жаданнем асобнага чалавека якасна змяніць сваё жыццё, стаць "як усе" паказаны праз адлюстраванне унутранага стану героя. Адчуванне незваротнасці здзейсненага, немагчымасць існавання ў двух светах (свеце чалавека і свеце жывёлы) найбольш ярка праяўляецца ў фінале аповесці: Леўка трагічна гіне, людзі ж, якія чакаюць убачыць труп ваўка, пазнаюць у ім свайго былога вяскоўца Грыцава-здрадніка. Падобныя сцэны адлюстравання смерці не з'яўляюцца арыгінальнымі як для беларускай літаратуры другой паловы XX стагоддзя, так і для сусветнай. А. Наврыч працягвае традыцыі В. Быкава ("На Чорных лядах", "Аблава"), В. Адамчыка ("Чужая бацькаўшчына"), В. Казько ("Выратуй і памілуй нас, чорны бусел"), Г. Гесэ ("Стэпавы воўк").

Смерць прынесла выратаванне Леўку, у нейкай ступені пмірыўшы яго са светам людзей, якія даруюць яму яго здраду і шкадуюць Грыцава. Гэты факт, на нашу думку, сведчыць пра



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

уменне беларусаў не памятаць зла. Такая жыццёвая філасофія дае магчымасць выжываць, падкрэслівае вызначальную сярод іншых народаў рысу беларусаў – талерантнасць.

Смерць у дадзеным выпадку з'яўляецца своеасаблівым памежным станам. Разам з тым, для галоўнага героя аповесці А. Наварычы "Цкаванне вялікага звера" такі стан жаданы. Ён уяўляе сабой вынік рэакцыі на жыццёвыя пакуты і адчування безвыходнасці. Смерць тут – гэта пазбаўленне ад праблем віны і пакарання, адзіноты, закінутасці ў чужы свет. Бо галоўны герой фактычна згубіў сэнс жыцця.

Такім чынам, праведзенае даследаванне аповесці А. Наварычы "Цкаванне вялікага звера" дазваляе зрабіць наступныя высновы:

Па-першае, для сучаснай беларускай літаратуры не характэрна выкарыстанне вобразаў у чыстым выглядзе. Часцей пісьменнікі звяртаюцца да сінтэтычных вобразаў. Гэты факт з'яўляецца сведчаннем уплыву постмадэрнісцкай эстэтыкі, у адпаведнасці з якой свет успрымаецца як эклектыка стыляў, жанраў, вобразаў. Не выключэнне з гэтага правіла з'яўляецца і твор А. Наварыча. У сваёй аповесці "Цкаванне вялікага звера" аўтар спалучае фантастычны і псіхалагічны тып аднаго з вобразаў.

Па-другое, пісьменнік мадэлюе вобраз у адпаведнасці з рознымі ўзроўнямі ўспрымання: Я-свядомасць і калелектыўная свядомасць. У Я-свядомасці героя на першым плане паказваецца звярыны пачатак: нежаданне мець зносіны з людзьмі, выбар месца для жыцця (лес), выбар сацыяльнага асяродку (жыве ў звярынай зграі). Калектыўная свядомасць вызнае адносіны да Леўкі Грыцава як да ваўкалака: успрымаюць яго паводзіны не толькі як вынік інстынкта, але найперш – розуму.

Па-трэццяе, спалучэнне ў адным вобразе рысаў і чалавека, і звера падкрэслівае экзістэнцыяльны характар сучаснай беларускай літартуры. Адлюстраванне адчужанасці, непаразуменні паміж людзьмі, рэзкага супрацьстаяння асобы і грамадства.

Па-чацвёртае, спалучаючы розныя пункты поглядаў пісьменнік імкнецца больш аб'ёмна выявіць такія актуальныя праблемы для нашага грамадства як віны і пакарання, здрадніцтва, адзіноты, чалавека ў чужым свеце, магчымасці людской натуры прыстасавацца да любога асяродку.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

1. *Бельскі А.І.* Мастацкая анімалістыка ў сучаснай беларускай літаратуры (да праблемы вывучэння і тыпалогіі) // Весн. Беларус. дзярж. ун-та: Сер. 4, Філалогія. Журналістыка. Педагогіка. – 2000. – № 2. – С. 28 – 32; 2. *Бельскі А.* Свет ад травы да зор: Беларуская паэзія: сістэма вобразаў прыроды, паэтыка пейзажу: дапам. для настаўнікаў. – Мінск: Нар. асвета, 1998. – 223 с.; 3. *Дуктава Л.Г.* Мастацкая анімалістыка ў беларускай літаратуры другой паловы XX стагоддзя: манаграфія. – Магілёў: МДУ імя А.А. Куляшова, 2009. – 184 с.; 4. *Козіч В.І.* Чалавек і прырода ў сучаснай беларускай прозе. – Мінск: Беларус. навука, 1998. – 96 с.; 5. *Козлова А.Г.* Анималистическая тема в современной советской прозе и традиции русской классической литературы: автореф. дис. ... канд. филол. наук: 10.01.02; Харьк. гос. пед. ин-т. – Харьков, 1990. – 18 с.; 6. *Наварыч А.* Рабкова ноч: аповесці, апавяданні / прадм. А. Карпюка;– Мінск: Маст. літ., 1988. – 173 с.; 7. *Смирнова А.И., Остапенко Е.В.*Анималистическая тема в современной русской прозе // Природа и человек в русской литературе: материалы Всеросийской научной конф., 1998 г. / Волгогр. гос. ун-т; отв. ред. А.И. Смирнова. – Волгоград: Изд-во Волгогр. гос. ун-та, 2000. – С. 120 – 126; 8. *Шамякіна Т.І.* Міфалогія Беларусі: нарысы. – Мінск: Маст. літ., 2000. – 398 с.; 9. *Эпштейн М.Н.* Природа, мир, тайник вселенной...: Система пейзаж. образов в рус. поэзии. – М.: Высш. шк., 1990. – 303 с.; 10. *Юнг К.Г.* Психология бессознательного: пер. с нем. – М.: "Канон+", 2003. – 400 с.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова